# СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**Вопытам дзеліцца партгрупорг. Партыйнае даручэнне: якім яму быць? ● Свята ў зялёнай штармоўцы ● Нашы замежныя сувязі ● Тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы ● Рэйд па кабінетах філалагічнага факультэта ● Цікавая навука хімія ● Дружыннікі падводзяць вынікі ● Нарыс «Кошт жыцця» ● Адкрыць старонку памяці ● Да новай сустрэчы, Вязынка! ● Што такое МАС? ● Карта, компас і... хуткія ногі**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (1206) ● 25 мая 1978 г.

Цана 2 кап.

## ПАДТРЫМЛІВАЕМ СУВЯЗІ

БДУ мае шырокія сяброўскія сувязі з многімі вышэйшымі навучальнымі і навуковымі цэнтрамі за мяжой. Аб гэтых сувязях расказвае начальнік аддзела замежных сувязей БДУ **А. АМЯЛЬКОЎ.**

**— Анатоль Аляксандравіч, калі ласка, раскажыце, па якіх напрамках вядзецца супрацоўніцтва і якія формы творчых сувязей існуюць паміж БДУ і навучальнымі ўстановамі замежных краін?**

— Наш універсітэт расшырае і ўмацоўвае навуковае і культурнае супрацоўніцтва з Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР), Сафійскім — імя К. Ахрыдскага (НРБ), Люблянскім (СФРЮ), Ягелонскім (ПНР) і універсітэтам г. Камагуэй (Куба). З гэтымі установамі мы падтрымліваем цесныя сувязі, абменьваемся кваліфікаванымі выкладчыкамі для чытання лекцый, праводзім сумесныя навуковыя даследаванні. Акрамя гэтага, мы накіроўваем сваіх супрацоўнікаў на навуковую стажыроўку ў капіталістычныя краіны, студэнтаў — на поўны курс навучання ў ВНУ сацыялістычных краін.

**— Якія задачы ставяцца перад вучонымі БДУ пры іх накіраванні за мяжу?**

— Перш за ўсё, нароўні з прапагандай дасягненняў Савецкага Саюза, — аказваць дапамогу ў развіцці навукі і культуры сацыялістычных і развіваючыхся краін, вывучаць вопыт замежнай навукі для наступнага ўкаранення ў народную гаспадарку.

**— Анатоль Аляксандравіч, Вы пералічылі некалькі відаў навуковых камандзіровак нашых вучоных у замежныя краіны. Не маглі б Вы назваць з іх ліку найбольш эфектыўную форму супрацоўніцтва?**

— Як паказала практыка, паранейшаму найбольш эфектыўнай формай камандзіровак з'яўляецца навуковая стажыроўка. Вынікі садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў, дазваляюць унесці карэктывы ў вучэбныя планы, распрацаваць новыя спецкурсы, удасканальваць вучэбна-метадычную работу.

Так, напрыклад, у мінулым годзе закончылі стажыроўку за мяжой старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай фізікі М. Н. Полазаў, асістэнт кафедры фізікі цвёрдага цела В. В. Хадасевіч, дацэнт кафедры фізічнай хіміі С. А. Сударыкаў. Вынікі даследаванняў, праведзеных гэтымі таварышамі, будуць выкарыстоўвацца ў навуковай і вучэбнай рабоце фізічнага і хімічнага факультэтаў.

**— І апошняе пытанне. Якую дапамогу аказвае Белдзяржуніверсітэт развіваючымся краінам?**

— Кожны год БДУ накіроўвае сваіх спецыялістаў на выкладчыцкую работу ў развіваючыяся краіны Афрыкі. Нашы вучоныя працуюць у Дэмакратычнай Рэспубліцы Алжыр, Рэспубліцы Малі, Конга, Судане. Выкладчыкі нашага універсітэта таксама працуюць і ў Індыі. У цяперашні час вывучаюць замежную мову на курсах пры Ленінградскім універсітэце супрацоўнікі фізічнага і хімічнага факультэтаў. Да паездкі ў Малагасійскую Рэспубліку і Конга рыхтуюцца выкладчыкі механіка-матэматычнага, гістарычнага, фізічнага факультэтаў і факультэта прыкладной матэматыкі.

**Інтэрв'ю правёў студэнт І курса журфака В. ТАБУЛІН.**

Вопытам дзеліцца партгрупорг

# ПАРТЫЙНАЕ ДАРУЧЭННЕ: ЯКІМ ЯМУ БЫЦЬ?

Размеркаванне партыйных даручэнняў — справа творчая, да яе нельга падыходзіць фармальна.

Дыяпазон даручэнняў вельмі вялікі. Ён вынікае з патрабаванняў жыцця, дыктуецца задачамі, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй: ажыццяўленне палітыкі КПСС, умацаванне партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны, праверка і кантроль за выкананнем камуністамі даручэнняў. Вялікае значэнне для нас маюць сёння даручэнні, якія звязаны з павышэннем эфектыўнасці навучальнага працэсу, якасці выхаваўчай работы.

Партыйная група кафедры высокамалекулярных злучэнняў і калоіднай хіміі, ажыццяўляючы рашэнні XXV з'езда КПСС, снежаньскага (1977) Пленума ЦК КПСС, імкнецца як мага паўней выкарыстаць свае сілы і магчымасці, веды і ўменні на карысць агульнай справе.

Значную ролю ў павышэнні эфектыўнасці працы адыгрывае правільная расстаноўка камуністаў, таму што партыйныя даручэнні з'яўляюцца сродкам прыцягнення кожнага да актыўнай выхаваўчай і арганізатарскай работы. Пры размеркаванні даручэнняў мы абавязкова ўлічваем індывідуальныя схільнасці і магчымасці камуністаў, іх вопыт, стаж і падрыхтоўку. Такім чынам, кожнае даручэнне павінна адпавядаць індывідуальным схільнасцям, разам з тым яно — закон для камуніста, які павінен прыкласці ўсе намаганні і выканаць даручэнне як мага лепш. У многім садзейнічае гэтаму кантроль за выкананнем партыйных даручэнняў. Трэба своечасова пацікавіцца, як камуніст выконвае даручэнне, якая яму патрэбна дапамога.

З мэтай умацавання дысцыпліны і арганізаванасці мы выкарыстоўваем справаздачы камуністаў на сходах партгруп, індывідуальныя субяседаванні.

Камуністы нашай партгрупы маюць пастаянныя даручэнні партыйнай арганізацыі хімфака. Так, камуніст В. М. Сідэрка — старшыня прафбюро хімфака, камуніст В. П. Мардыкін — член партбюро.

Работа з камсамольцамі — важны ўчастак партыйнай работы. У гэтым годзе за яе адказваў камуніст В. П. Мардыкін. Ён правёў аналіз бягучай паспяховасці студэнтаў IV курса, высветліў прычыны адставання ў вучобе. З'яўляючыся куратарам групы, ён рэгулярна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні палітінфармацый са студэнтамі, арганізаваў у інтэрнаце цікавы дыспут па кнізе Ю. Бондарава «Бераг». Разам з выкладчыцай нашай кафедры А. М. Анціпавай у перыяд зімовай экзаменацыйнай сесіі яны наведалі інтэрнат і далі кансультацыі студэнтам па агульнаму курсу хіміі высокамалекулярных злучэнняў.

Справаздача аб рабоце, праведзенай В. П. Мардыкіным, заслухоўвалася на сходзе партгрупы і была адобрана.

Вялікую ўвагу аддаём мы і грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў. Усе выкладчыкі кафедры былі прыцягнуты да гэтай работы. Справаздачы студэнтаў па грамадска-палітычнай практыцы праходзілі пры актыўным удзеле членаў партгрупы і з'явіліся крытычным аналізам работы як студэнтаў, так і выкладчыкаў.

Актыўная самастойная навукова-даследчая работа студэнтаў — важны элемент у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. Гэты ўчастак работы быў замацаван за Г. М. Паўлючэнка, якая на працягу некалькіх год курыравала СНТ хімфака. Дзейнасць СНТ кафедры абмяркоўвалася на пасяджэнні партгрупы, былі выказаны крытычныя заўвагі, намечаны магчымасці больш шырокага прыцягнення студэнтаў да навуковых даследаванняў. У выніку на красавіцкай студэнцкай навуковай канферэнцыі колькасць дакладаў значна павысілася ў параўнанні з мінулым годам.

Неабходна адзначыць, што нягледзячы на вялікую творчую актыўнасць студэнтаў, паспяховасць іх пакідае жадаць лепшага. На жаль, некаторыя студэнты засвойваюць лекцыйны матэрыял у перыяд сесіі, непасрэдна перад залікам або экзаменам. Партыйная група прыкладае максімум намаганняў да таго, каб павысіць узровень лекцый, зацікавіць студэнтаў. Выкладчыкі кафедры пастаянна павышаюць кваліфікацыю, працуюць над сабой. Гэта дазваляе павысіць эфектыўнасць лекцый, скласці цікавы ілюстрацыйны матэрыял. З мэтай больш глыбокага засваення студэнтамі ведаў некаторым выкладчыкам даручана ў 1978 годзе скласці тэсты па асноўнаму курсу хіміі высокамалекулярных злучэнняў і спецкурсах.

Такім чынам, уся дзейнасць нашай партыйнай групы накіравана на тое, каб найлепшым чынам выканаць задачы, якія стаяць перад намі, стварыць найлепшыя ўмовы для плённай работы ўсяго калектыву.

**Г. ПАЛЮЧЭНКА,**
**партгрупорг кафедры высокамалекулярных злучэнняў і калоіднай хіміі.**

**Шмат сіл і старання неабходна прыкласці для таго, каб набор студэнтаў на першыя курсы прайшоў арганізавана. Таму такое вялікае значэнне надаецца рабоце прыёмнай камісіі, якая, як заўсёды, размясцілася ў восьмым пакоі геаграфічнага корпуса.**

**Пакуль што заяў паступіла нямнога, але наперадзе — самая гарачая пара.**

**НА ЗДЫМКУ: дакументы на факультэт гісторыі здае Зінаіда СКУРЧЫК.**



Да 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі

# Свята ў зялёнай штармоўцы

**(Рэпартаж з ІІ агульнауніверсітэцкага злёту студэнцкіх будаўнічых атрадаў).**

8 гадзін раніцы. Зялёны гай, што ў Шчомысліцах, запаўняюць студэнты ў будатрадаўскай форме.

Сёння, 21 мая, пачынае работу ІІ агульнауніверсітэцкі злёт лепшых студэнцкіх будаўнічых атрадаў. 8 атрадаў выстраіліся на лінейку гатоўнасці.

Адбыўся мітынг. Выступаючыя адзначылі, што гэты працоўны семестр для студэнцкіх будаўнічых атрадаў будзе асаблівым. Набліжаюцца знамянальныя даты ў жыцці ўсяго савецкага народа — 60-годдзе ВЛКСМ, 60-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі. Гэтыя падзеі абавязваюць працаваць з яшчэ большым натхненнем, па-ўдарнаму, па-камсамольску. І мы абяцаем з гонарам несці высокае званне будатрад-78.

У неба ўзнімаецца сцяг. Злёт пачаўся.

Надзвычай цёплае надвор'е спрыяе арганізацыі работы. Ля спартыўных пляцовак сабраліся будатрадаўцы, балельшчыкі. Зараз адбудуцца спаборніцтвы па валейболу, футболу, баскетболу і спартыўнай эстафеце.

Зазірнём на першую пляцоўку, дзе праходзяць спаборніцтвы па валейболу паміж камандай будатрада імя Курчатава (факультэт радыёфізікі і электронікі) і камандай будатрада «Маладосць» (хімфак). Спрэчка ідзе за першае і другое месца. Лік — 1:1. Гэта апошняя, рашаючая партыя. Спачатку лік вядзе каманда атрада «Маладосць». Затым, сабраўшы ўсе свае сілы і ўменне, курчатаўцы абганяюць сапернікаў. Хутка разыграная камбінацыя — і мяч на пляцоўцы каманды будатрада «Маладосць». Выдатна гуляюць курчатаўцы В. Лебедзеў, У. Кобель і іншыя. Гучыць свісток суддзі. Курчатаўцы перамаглі!

Не меншы напал барацьбы і на іншых пляцоўках. У спартыўных гульнях прымае ўдзел і каманда арганізацыйнага камітэта. Выступае даволі паспяхова: абыграла ўсе каманды будатрадаў па баскетболу.

...Гучыць сігнал. Рабяты ўдзельнічаюць у працоўным дэсанце. Гэта — праверка сіл перад трэцім працоўным семестрам.

Цікавым, вясёлым і шматгранным было выступленне агітбрыгад.

Атрады зноў выстройваюцца на лінейку. Злёт падыходзіць к канцу. Сакратар камітэта камсамола А. А. Тозік падвёў вынікі, адзначыў пераможцаў злёту. Ён сказаў, што злёт увогуле паказаў добрую падрыхтоўку студэнтаў да працоўнага семестра.

Затым пераможцам уручаюцца ўзнагароды.

Такім чынам, пачатак ёсць. Выдатных працоўных поспехаў, будатрад-78!

**Віктар ЧАРНУШЭНКА,**
**удзельнік злёту студэнцкіх будаўнічых атрадаў.**

# НЕ КАНЧАЕЦЦА СЯБРОЎСТВА

На стэндзе святочна ўбранай залы вялізны плакат «Няхай жыве дружба паміж савецкім і в'етнамскім народамі». На эстрадзе радыёапаратура, музычныя інструменты. На сценах — плакаты, фотаздымкі, якія расказваюць аб геральчнай барацьбе в'етнамскага народа супраць амерыканскіх агрэсараў, аб будаўніцтве новага жыцця, аб справах в'етнамскай моладзі, аб нацыянальнай культуры.

Зала запаўняецца савецкімі і в'етнамскімі студэнтамі, хлопцамі і дзяўчатамі з іншых краін. Яны садзяцца за столікі, вечар пачынаецца.

Наперад выходзіць намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата Таня Любушкіна:

— Мы пачынаем наш апошні, заключны вечар дружбы, смеху, песень, знаёмстваў. Запрашаем усіх прыняць самы актыўны ўдзел. Няхай усім сёння будзе лёгка і весела.

Слова бярэ аспірант з В'етнама Лэ Зьен. Ён расказвае аб гісторыі в'етнамскага народа, аб барацьбе, якую яму прыйшлося весці на працягу многіх стагоддзяў супраць розных іншаземных заваёўнікаў, аб тым, што нарэшце настаў шчаслівы час для в'етнамскага народа. Вось ужо тры гады, як В'етнам жыве свабодна, — тры гады назад апошні захопнік пакінуў шматпакутную в'етнамскую зямлю. У канцы Лэ Зьен выказаў сардэчную ўдзячнасць савецкім студэнтам за ўвагу і клопат, праяўленыя імі ў дні савецка-в'етнамскай дружбы. За тое, што яны зрабілі ўсё, каб гэтыя дні прайшлі як мага лепш.

— У Мінску мы сябе адчуваем, як дома,—сказаў Лэ Зьен.

Наступнымі выступаюць прадстаўнікі кубінскага, гвінейскага, чэхаслаўацкага зямляцтваў. Яны віншуюць усіх прысутных з Днём Перамогі, з Першамаем, жадаюць усім міру і шчасця.

На сцэну запрашаюцца пераможцы шахматна-шашачнага турніру. Імі аказаліся пераважна в'етнамскія студэнты. Пераможцам уручаюцца прызы.

Пачынаецца канцэрт мастацкай самадзейнасці. Група в'етнамскіх студэнтаў выконвае песню «Хо Шы Мін у дзень перамогі». У ёй пяецца аб доўгачаканым дні, аб цяжкім шляху да яго, аб праўдзіўры в'етнамскага народа Хо Шы Міне. Гучаць песні, выконваюцца танцы, парадныйныя сцэнкі. Артысты — самі гледачы. У зале ўзрывы смеху, апладысменты, жарты, ажыўленыя размовы. Ідзе заключны вечар, а ззаду— тыдзень цікавых сустрэч, абмену думкамі, знаёмстваў — тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы, які быў арганізаван на механіка-матэматычным факультэце.

Успамінаецца першы дзень, дзень адкрыцця. Савецкія і в'етнамскія студэнты сабраліся ў аўдыторыі, дзе вісяць партрэты Леніна і Хо Шы Міна, лозунгі савецка-в'етнамскай дружбы. Выступілі прэзідэнт в'етнамскага зямляцтва Лэ Зьен і намеснік дэкана факультэта Л. П. Прымачук, савецкія і в'етнамскія студэнты. Затым усе разам пайшлі на плошчу Леніна і ўсклалі кветкі да помніка вялікаму правадыру. Была арганізавана сустрэча з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны палкоўнікам у адстаўцы, супрацоўнікам факультэта А. С. Мізрахі, які расказаў аб слаўных баях Савецкай Арміі, аб мужнасці і гераізме савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Была праведзена канферэнцыя чытачоў па кнізе генерал-лейтэнанта І. Ласкіна «На шляху да пералому», у якой расказваецца аб Сталінградскай бітве.

Было яшчэ шмат цікавых сустрэч, дыскусій, гутарак, пытанняў. Савецкія і в'етнамскія студэнты даведаліся шмат новага адзін аб адным, аб жыцці брацкіх народаў.

Я папрасіў у Нгуен Куанг Тана, студэнта IV курса ФПМ, які сядзеў са мной за адным столікам, выказаць сваю думку аб мінулым тыдні:

— Гэтыя дні застануцца ў маёй памяці надоўга, — сказаў Нгуен Куанг Тан.—Было вельмі весела, цікава. Мы набылі шмат новых сяброў. Я ўдзячны за ўсё гэта савецкім студэнтам. Наша дружба яшчэ больш замацавалася.

**А. ДЫНІКАЎ.**



## НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

**Пачалася летняя экзаменацыйная сесія. Ёй папярэднічала напружаная вучэбная і практычная работа.**

**Добра папрацавалі на працягу семестра студэнты IV курса факультэта радыёфізікі і электронікі Аляксандр Якунін і Вячаслаў Храброў.**

**На здымку: ідуць заняткі ў лабараторыі паўправаднікоў факультэта радыёфізікі і электронікі.**

**Фота М. Дубовіка.**

Справы вучэбныя

# КАБІНЕТ—ПАМОЧНІК

Наш рэйд на філфаку быў праведзен з мэтай высветліць, як вучэбныя кабінеты дапамагаюць студэнтам у вучобе.

...Ціхі, утульны пакойчык, на стале — кветкі, на сценах — партрэты У. Маякоўскага, А. Талстога, С. Ясеніна. Так, вы здагадаліся, мы ў кабінеце рускай савецкай літаратуры. Гутарым з выкладчыкамі і пераконваемся, што ўмовы для заняткаў тут добрыя. У кабінеце можна пазнаёміцца з падборкай работ супрацоўнікаў кафедры, з выстаўкай студэнцкіх работ, выкананых у час практыкі. Аднак ёсць свае нявырашаныя пытанні: няма ў кабінеце партатыўных магнітафонаў, фотаапаратаў. Патрэбны прайгравальнік і пласцінкі з галасамі пісьменнікаў, паэтаў. Вось таму і прыходзіцца дацэнту кафедры Соф'і Аляксееўне Лысенка прыносіць свой асабісты магнітафон на заняткі.

Удзельнікі рэйду адзначылі яшчэ і тое, што ў кабінеце адсутнічаюць падшыўкі газет.

Атмасфера дзелавітасці пануе ў кабінеце агульнага і славянскага мовазнаўства.

Гутарка з лабаранткай А. Л. Юдаевай ішла ў асноўным пра папаўненне кабінета ўсім неабходным. Пачулі мы скаргі, што не хапае спецыяльных шафаў, скрынак для каталогаў.

Падабаецца студэнтам і кабінет рускай мовы (лабарантка І. І. Засімовіч). Вось і цяпер у пакоі засяроджана схілены галовы юнакоў і дзяўчат над падручнікамі. Скаргаў на недахоп літаратуры няма. Аднак у кабінеце ўсё не так добра, як хацелася б. Няма вешалкі, дошкі аб'яў.

Сапраўдны подых сесіі адчуўся ў кабінеце беларускай літаратуры. Тут мнагалюдна, але не шумна, амаль усе столікі заняты. Нехта са студэнтаў-дыпломнікаў кансультуецца са сваім кіраўніком, рыхтуюцца да залікаў і экзаменаў малодшакурснікі. Канешне, і ў гэтым кабінеце ёсць свае «але»: дыпломныя работы мінулых год і фальклорныя матэрыялы захоўваюцца на кафедры — іх не прымае архіў. Пішучыя машынкі сапсаваныя. Усе гэтыя пытанні патрабуюць свайго вырашэння.

Наступнай была кафедра замежных моў. Тут для лепшага засваення студэнтамі вучэбнай праграмы выкарыстоўваюцца розныя тэхнічныя сродкі. Дэманструюцца вузкаплёначныя фільмы на англійскай, нямецкай, французскай і іншых мовах. Студэнты маюць магчымасць праслухаць начытаныя на магнітафон з падручнікаў тэксты.

Кабінет працуе ўвесь дзень. Для самападрыхтоўкі студэнтаў адведзена пяць гадзін (з 12 да 17). Адначасова тут могуць займацца каля 50 чалавек. Гэтым кабінетам з задавальненнем карыстаюцца не толькі філфакаўцы, але і студэнты іншых факультэтаў.

Вось і апошні пакой — кафедра замежнай літаратуры. З кабінетам нас пазнаёміла Ж. В. Адуцкевіч. Сюды прыходзяць займацца не толькі філолагі, але і журналісты. Кабінет мае выдатны каталог, аформлена паліца з выданнямі супрацоўнікаў кафедры. Усё падрыхтавана для работы студэнтаў. А калі ў кабінеце няма патрэбнай кнігі, лабарант абавязкова параіць, дзе яе можна атрымаць.

У выніку рэйду мы пераканаліся, што ў кабінетах філфака створаны добрыя ўмовы для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў. Але ёсць яшчэ шмат недахопаў, якія трэба ліквідаваць, бо нават дробязі могуць значна перашкодзіць падрыхтоўцы да залікаў і экзаменаў.

С. ВАЛЕЙНЯ,
член камітэта камсамола філфака.
А. МАРЧУК,
студэнт факультэта журналістыкі.



**Вялікую ролю ў навучальным працэсе студэнтаў універсітэта адыгрывае капіравальна-памнажальны аддзел. Работнікі аддзела друкуюць неабходныя навукова-тэхнічныя планы, размнажаюць іншамоўныя тэксты.**

**На здымку: работнік аддзела, практыкант Мінскага паліграфічнага вучылішча Віктар Сасноўскі.**

**Фота А. Цвяха.**



**Студэнтка мехмата І. Смяян сваю першую сесію здала на «выдатна». Добра падрыхтавалася яна і да летняй экзаменацыйнай сесіі.**

**Фота І. Тоўсцік.**

# ЦІКАВАЯ НАВУКА ХІМІЯ

Цёмнавалосая, з вялікімі шэрымі вачыма, Ніна, здавалася, чаравала над дзесяткамі прабірак.

— Цікавая ўсё ж штука, гэтая навука хімія, — гаворыць яна.

З Нінай нельга не згадзіцца, гледзячы, з якой цеплынёй, стараннасцю, любоўю праводзіць студэнтка хімічныя доследы.

— А пачалося ўсё яшчэ ў школе, — расказвае Ніна. Валянціна Паўлаўна Беразоўская, настаўніца хіміі Касаўскай сярэдняй школы Івацэвіцкага раёна, што на Брэстчыне, у якой я вучылася, запрасіла мяне зайсці неяк у лабараторыю.

Прыйшла і, як кажуць, «захварэла» хіміяй. Гадзінамі праседжвала над доследамі, радавалася, калі ўпершыню атрымала з меднай манеты «сярэбраную», потым «залатую». І, вядома, часта прыходзілася чуць вымовы ад маці за пашкоджаную кіслатой сукенку.

Потым уступныя экзамены ва універсітэт на хімічны факультэт. Гады вучобы праляцелі непрыкметна. За гэты час Ніна многае зразумела, пазнала таямніцы гэтай цудоўнай навукі і галоўнае — знайшла сваё месца ў жыцці.

Зараз працуе дзяўчына над дыпломнай работай па тэме «Фарбаванне поліэфірных валокнаў дысперснымі фарбавальнікамі».

— Тэма цікавая, патрабуе глыбокіх ведаў, уважлівасці, настойлівасці, — гаворыць аспірант кафедры аналітычнай хіміі А. Л. Гулевіч, які дапамагае Ніне ў выкананні работы.

— І ўсё гэта ў Н. Карповіч ёсць, — як бы працягвае яго думку Я. М. Рахманько, непасрэдны кіраўнік работы.

Сёлета Ніна атрымлівае дыплом, яе будучая спецыяльнасць — інжынер-тэхнолаг.

Пачнецца новае, самастойнае жыццё. Якім яно будзе? Не раз задумвалася Ніна над гэтым пытаннем. Думае і цяпер.

Поспехаў табе, Ніна!

**А. ЖЫЛІНСКАЯ.**



**На здымку:** Ніна Карповіч за доследамі.

Фота **аўтара.**

## ДА ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ




Ул. БЕЛЬСКІ.

НАРЫС

**Гэты расказ пра чалавека, камуніста. Расказ пра былога старшага ўрача 133-га зенітна-артылерыйскага палка, начальніка шпіталя, які зараз працуе ўрачом-неўрапатолагам клінічнага аддзялення БДУ, палкоўніка запасу Сяргея Сяргеевіча ЦІХАМІРАВА.**



ДЗІЎНАЙ здавалася гэтая груша, нейкай асаблівай і таямнічай. Сапраўды дзіўна: белая коўдра снегу і груша... белая. Белая не ад снегу, яна цвіла. У яе была вясна, і, непакорная, яна не схілілася перад зімой. Не, наадварот, яна кінула выклік ёй. Гаварылі многія, што яна нечым падобная на Тоню Мартынаву, а можа, Тоня на яе.

— А ты сапраўды на Тоню падобная, ну прама, вылітая. Ганарлівка калючая...

Старшына пагладзіў па шурпатаму ствалу, панюхаў кветачку. Аўтамат споўз з пляча і нязручна павіс на руцэ.

— Порах? Дзіўна! Як гэта, няўжо ўсё, а дзе ж твой водар, калючка ты мая?

Нешта трапянулася ў сэрцы, нешта непрыемнае разлілося ўнутры. Ён не хацеў верыць, але прадчуванне, ліпкае і назойлівае, доўга не пакідала яго.

Не ведаў ён, чым прыцягнула яго гэтая дзяўчына, але не мог без яе. Ды і сустрэліся яны тут, каля гэтай грушкі. Адразу пайшоў да яе, хацеў пабачыць, падзяліцца думкамі. 6-я батарэя дальнабойшчыкаў стаяла на ўскрайку лесу— адтуль быў самы зручны агляд мясцовасці.

Ад нечаканасці ўздрыгнуў, схапіўся за аўтамат, але зразумеў — вартавы.

«Разведчык называецца, у лірыку кінуўся»,—пакпіў з сябе.

— Хто ідзе?

Адказаў пытаннем на пытанне:

— Дзе Тоня?

— Якая Тоня?

Вартавы не зніжаў пагрозлівага тону і клацнуў затворам.

— Камандзір дзе? Ды ты не пазнаў, ці што? Адвядзі «пушку» ўбок, ваяка.

— Ты мне не надта, — вартавы, відаць, зразумеў, хто перад ім, але хацеў агрызнуцца. —У сябе камандуй, а не тут. Як совы жывуць. Днём спяць, ноччу ходзяць, а потым разбірайся з імі. Адпачывае камандзір, чаго табе?

— Ды ты пусціш ці не, балаболка чортава, а то вось пакажу саву!

— Правальвай, але як спіць —не будзі, няхай адпачне.

Падышоў да сярэдняй зямлянкі, дзе павінна быць Тоня. Гулка зарыпелі намарожаныя дзверы, у твар ударыла цяплом. «Так і ёсць, спіць. Не аддзяленне адпачывае. Ну і няхай, заўтра прыйду».

У сцяне тырчала зенітная гільза, з яе палахліва хліпаў язычок полымя, асвятляючы нары ўскрай зямлянкі, на якіх спалі дзяўчаты.

— Спі, а я пайшоў, калючка чарнавокая.

Выйшаў, агледзеўся і накіраваўся ў бок свайго падраздзялення.

ЁН ПРАХАПІЎСЯ ад першага выбуху. Тварылася нешта такое, што спачатку не змог зразумець, што да чаго. Зразумеў адно: іх абстрэльваюць.

— Усім ва ўкрыцці! Хутчэй! Я да начальніка штаба, — кінуў на хаду і выбег з зямлянкі.

Разлапістую елку падкінула і, як трэску, расшчапіла надвая, шмякнула вобземлю. Быццам штапель, з трэскам, рвалі міны зямлю, шпурлялі ў неба, нібы запалкі, бярвенні. Там, дзе стаяла 6-я батарэя, было нейкае месіва: з зямлі, снегу, жалеза, крыві... Кінуўся да Тонінай зямлянкі. Чорным страшным вокам глядзела яма, абапал якой валяліся бярвенні... Страшна...

— Старшына, назад, хутка! Дзе твае людзі?

Малодшы лейтэнант яшчэ нешта крыкнуў, але выбух снарада заглушыў яго. Старшына нібы апрытомнеў, кінуўся расцягваць бярвенні, якія яшчэ гарэлі. Ён не пазнаў Тоню. Гэта было нешта акрываўленае, абпаленае. За ім кінуліся іншыя, расцягвалі галавешкі, разграбалі зямлю. Нехта падагнаў павозку.

— У санчасць, хутчэй.

— Тут шпіталь недалёка, кіламетры са тры.

— Старшына, вазьміце сваё аддзяленне, пойдзеце таксама, — начальнік штаба глянуў на камандзіра разведчыкаў.

### НЯМЫ СВЕДКА

...Прыгожа летам у вёсцы. Яшчэ не ўзыйдзе сонейка, а ўжо вёска ажывае: дзесьці закрычыць певень, яму адгукнецца другі, трэці, і ўжо цэлы хор ранніх спевакоў зацягвае кожны на свой лад. У полі лясне па-заліхвацку сваёй даўжэзнай пугай пастух — вёска ўся на нагах. Некалькі хвілін чуваць звонкі, быццам клёкат бусла, перастук малаткоў — ад кляпання кос.

Сяргей не прыкмеціў, як міжволі думкамі апынуўся дома, на Горкаўшчыне. Але думкі хутка стануць явай. Білет на цягнік ужо ляжыць у кішэні, нават нумар вагона і месца памятаў. Ён расшпіліў кіцель — душна. На Бранскім вакзале нягледзячы на позні час было шмат пасажыраў, большая частка, відаць, курортнікаў. Чаму не ехаць адпачыць, самы час —чэрвень.

Спякота, як ніколі, нават у аўдыторыях, куды іх, ваенных медыкаў, сабралі на перападрыхтоўку, сядзець было проста невыносна. І вось, нарэшце, шэсць месяцаў вучобы засталіся ззаду. Наперадзе — адпачынак. Сяргей прайшоўся па зале, выйшаў на перон, зверыў гадзіннік — да адпраўлення заставалася некалькі хвілін.

«Вазьму чамадан, ды лепш тут пастаю».

— Таварыш капітан, дазвольце звярнуцца, лейтэнант Сідарэнка. Ваша прозвішча Ціхаміраў?

— Так, капітан Ціхаміраў. А ў чым справа? — Сяргей здзіўлена паглядзеў на лейтэнанта.

— Вам тэрмінова патрэбна звярнуцца ў ваенкамат. Вось загад.

Лейтэнант хутка выхапіў з кармана гімнасцёркі паперку, працягнуў Сяргею.

— Я магу ісці?

— Пачакай, лейтэнант. Памылкі ніякай быць не можа?— запытаў з нейкай надзеяй, але сам мала верыў у яе. Часта здаралася вось так, але цяпер... Ды і ўсё павінна быць у парадку.

— Не, памылкі быць не можа. Падпалкоўніка Высакагорава ведаеце? Сам падпісваў.

— Растлумачыць не можаш, хоць прычыну?

— Вайна, таварыш капітан. Хутчэй, вас чакаюць.

Сказаў, як выстраліў. Вайна...

Сяргей глянуў на пасажыраў, якія мітусіліся на пероне.

— Пайшлі, лейтэнант, чаго стаім. Дапамажы мне пажыткі несці.

Выняўшы з кішэні білет, хацеў выкінуць, але зноў палажыў.

— Няхай будзе, апошні білет перад вайной, нямы сведка разбітых ушчэнт мар...

Да ваенкамата дабраліся даволі хутка. Лейтэнант, ды і сам Сяргей ведалі Бранск добра. Ішлі завулкамі, цёмнымі, здавалася, там ніхто і не жыў.

— Таварыш капітан, сюды вунь, вокны свецяцца, — лейтэнант паказаў у другі бок вуліцы.

Падпалкоўнік Высакагораў стомлена падняў вейкі.

— А, капітан Ціхаміраў.

— Таварыш падпалкоўнік...

— Не трэба, капітан, сядай. Лейтэнант, скажыце, каб крыху сціхлі.

Лейтэнант выйшаў, нешта сказаў, і шум на калідоры сціх.

— Слухаю вас, таварыш падпалкоўнік.

— Вось што, капітан, тут мы толькі збіраліся, вы крыху спазніліся. Растлумачыць, чаму вярнулі? Вайна, капітан.

Пагладзеў на Сяргея, чамусьці горка ўсміхнуўся:

— А білет не выкідвай, з'ездзім пасля вайны.

Усміхнуўся толькі на хвіліну і зноў спахмурнеў.

— Паперы атрымаеш у страявым аддзеле, там жа ўсё растлумачаць падрабязна. Заўтра прыступім да фарміравання паходнага лазарэта, да вечара павінна ўсё быць гатова. Начальнікам лазарэта назначаешся ты. Жадаю поспеху, капітан.

**(Працяг будзе).**

Кіраўнік пошукавай групы «Доўг» факультэта журналістыкі, студэнт II курса Тадэвуш Чарнавус расказаў нашаму карэспандэнту, над чым пошукавая група ў апошні час вядзе работу.

— У сваёй прамове на XXVI з'ездзе ЛКСМБ першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў звярнуўся да моладзі з заклікам прадоўжыць высакародную справу — запісваць расказы аб барацьбе з фашызмам усіх без выключэння ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху і патрыятычнага падполля, усіх відавочцаў ратных і працоўных подзвігаў нашых людзей у гады ваеннага ліхалецця.

Не праходзіць і дня, каб не была адкрыта яшчэ адна старонка памяці сэрцаў чалавечых, неацэнныя сведчанні якіх будуць пакладзены ў аснову летапісу народнай славы.

# АДКРЫЦЬ СТАРОНКУ ПАМЯЦІ




Група «Доўг» факультэта журналістыкі другі год займаецца пошукавай работай. За гэты час выяўлена каля 70 былых студэнтаў Камуністычнага інстытута журналістыкі — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Запісана дваццаць расказаў-успамінаў. Архіў групы налічвае шматлікія дакументы ваенных гадоў, фотаздымкі. Актыўна вядуцца работы па падрыхтоўцы матэрыялаў для Кнігі Памяці. У перспектыве плануецца стварыць факультэцкі музей на аснове матэрыялаў групы «Доўг». Многа ўвагі і энергіі пошукавай рабоце аддаюць студэнткі II курса Л. Брыжэвіч, А. Цярэнцьева, Л. Бусько.

Да Дня Перамогі нашы пошукаўцы падрыхтавалі чарговы спецвыпуск насценнай газеты «Гаворым з табой, кіжавец». Вялікімі чырвонымі літарамі напісаны словы: «Спыніся, студэнт! Перад табой жывая гісторыя подзвігу!» Тут жа змешчаны цікавыя расказы пра ваенных журналістаў, мужных падпольшчыкаў.

Галоўная крыніца нашага пошуку — жывыя сведкі, а сустрэчы з імі для нас заўсёды хвалюючыя.

Памятаю, як пасля сустрэч з мінскімі падпольшчыкамі Ядзвігай Міхайлаўнай Савіцкай і Героем Савецкага Саюза Аляксандрам Андрэевічам Філімонавым пошукаўцы дзяліліся ўражаннямі. Нехта горача, з добрай зайздрасцю сказаў тады: «Вось гэта людзі! Кожны— кнігі варты».

**М. КУРГАНСКІ.**

# ДРУЖЫННІКІ ПАДВОДЗЯЦЬ ВЫНІКІ

Пасля злёту лепшых дружыннікаў універсітэта наш карэспандэнт звярнуўся з пытаннямі да камандзіра добраахвотнай народнай дружыны універсітэта Аляксандра Адамавіча **Сідарэнкі.**

— Раскажыце, калі ласка, што робіцца штабам ДНД універсітэта для больш якаснай арганізацыі дзяжурства на вуліцах нашага горада?

— Ва універсітэце налічваецца адзінаццаць добраахвотных народных дружын, якія аб'ядноўваюць у сваіх радах больш тысячы дружыннікаў. Залог поспеху нашай работы — гэта перш за ўсё правільная яе арганізацыя. Штаб ДНД Белдзяржуніверсітэта распрацаваў план мерапрыемстваў, накіраваных на актывізацыю работы дружын. Мы рэгулярна праводзім нарады з камандзірамі ДНД факультэтаў з мэтай каардынацыі дзейнасці і абмену вопытам работы. А пэўны вопыт ужо назапашан. Дастаткова сказаць, што за 1977 год дружыннікамі БДУ затрымана больш сямідзесяці правапарушальнікаў у кантралюемым намі раёне. Вельмі добра адзываецца аб нашых дружынніках старшы участковы інспектар раёна Н. Т. Каляда.

— Што, на ваш погляд, з'яўляецца неабходным для ўмацавання студэнцкай дружыны кожнага з факультэтаў?

— Па-мойму, для эфектыўнай і якаснай работы нашых дружын неабходна: правядзенне персанальнага падбору студэнтаў у рады дружыннікаў з улікам іх перш за ўсё ідэйна-палітычных якасцей, павелічэнне ў саставе дружын колькасці рабят са старэйшых курсаў. У немалой ступені наша работа залежыць і ад таго, наколькі дэканаты, партыйныя і камсамольскія арганізацыі факультэтаў дапамагаюць нам, як яны мабілізуюць лепшыя сілы студэнтаў на барацьбу з правапарушальнікамі, наколькі рэгулярна заслухоўваюць справаздачы камандзіраў дружын факультэтаў і наколькі дзейсную дапамогу аказваюць кіраўнікам дружын у выкананні пастаўленых перад імі задач.

— І ў канцы нашай гутаркі хацелася б пачуць аб вашых планах.

— Мы будзем імкнуцца весці сваю работу так, каб яшчэ больш актывізаваць дзейнасць кожнай дружыны факультэта, кожнага дружынніка.

*Інтэрв'ю вялі:*
**Ю. ЮРКЕВІЧ,**
**А. ГАЙДУК.**

Насустрач 60-годдзю ВЛКСМ

# Да новай сустрэчы, Вязынка!

**Няхай галініцца і караніцца**
**Пявучае купалаўскае дрэва.**
**Р. БАРАДУЛІН.**

Гулкую цішыню майскай раніцы прарэзваюць настойлівыя гукі горна. І адразу ж адгукаецца барабан. На ціхай, соннай яшчэ вуліцы паяўляецца калона юнакоў і дзяўчат. Палымнеюць чырвоныя сцягі, трапечуць хусцінкі з надпісам «Вязынка». Гэта ўдзельнікі III злёту студэнтаў-філолагаў, які сёлета прысвечан 60-годдзю ВЛКСМ і Дню Перамогі.

Яшчэ ў лютым быў створан арганізацыйны камітэт злёту, аб'яўлен конкурс на лепшую праграму. Праводзіліся працоўныя дэсанты, каб зарабіць патрэбныя сродкі. Самыя актыўныя і добрасумленныя студэнты былі абраны дэлегатамі на гэты злёт.

Наперадзе калоны вось ужо трэці год запар па склаўшайся традыцыі ва ўзорным парадку ідуць барабаншчыцы і аркестр Палаца культуры прафтэхасветы.

Калона накіроўваецца да універсітэцкага гарадка. Шэсце спыняецца ля Памятнага знака студэнтам і выкладчыкам універсітэта, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мінутай маўчання ўшанавалі прысутныя памяць тых, вядомых і невядомых абаронцаў Радзімы, што не вярнуліся з вайны. Зачырванелі ля падножжа абеліска цюльпаны.

Урачыстая лінейка закончана. І вось ужо цягнік імчыць сваіх маладых пасажыраў у купалаўскія мясціны, да Вязынкі. А на месцы чакае шмат клопатаў —трэба абсталяваць лагер, упрыгожыць палаткі, павесіць газеты, падрыхтаваныя спецыяльна да злёту.

Надвор'е не песціць. Неба закрыта хмарамі, ідзе дождж. Але нікога не пакідае бадзёры і вясёлы настрой. Прама на пляцоўцы сярод палатак пад гукі аркестра пачынаюцца танцы.

11 гадзін раніцы. Удзельнікі злёту выстройваюцца ў цэнтры пляцоўкі. Гучаць рапарты аб гатоўнасці да злёту. Адкрывае яго дэкан філалагічнага факультэта А. А. Воўк. Права падняць сцяг злёту прадастаўляецца Тамары Абрамчык і Але Гофман. Перад моладдзю выступаюць ветэраны вайны Ф. Ф. Церашчонак і генерал-маёр П. М. Машэраў. Наташа Гоманава чытае верш, прысвечаны ветэранам. Адначасова ім павязваюць хусцінкі ганаровых удзельнікаў злёту. Пляменніца Янкі Купалы Я. Ю. Раманоўская звярнулася да юнакоў і дзяўчат са шчырымі прывітальнымі словамі і ўручыла памятны падарунак. Прыйшлі павіншаваць сваіх сяброў-студэнтаў вучні падшэфнай Вязынскай школы. Іх выступленне выклікала вясёлыя ўсмешкі на тварах прысутных.

Потым любіцелі паэзіі накіроўваюцца да помніка Янку Купале. Тут праводзіцца гадзіна паэзіі. Шчырыя, пранікнёныя вершы свабодна і гучна ліліся ў наступіўшай цішыні. Здавалася, усё наваколле прыслухоўваецца да іх. І ўяўлялася, што пройдзе яшчэ некалькі хвілін і сам Купала з добрай, ветлівай усмешкай на твары падыйдзе да гэтых юнакоў і дзяўчат, якія так шчыра любяць сваю родную літаратуру.

Гучалі вершы вядомых беларускіх паэтаў — Міколы Аўрамчыка і Міколы Шушкевіча. Вынеслі свае творы на суд прысутных члены літаб'яднання «Узлёт» Мікола Мінзер, Уладзімір Марук, Кастусь Цыбульскі і інш.

Для першакурснікаў была арганізавана экскурсія ў музей Янкі Купалы. А ў гэты час удзельнікі працоўнага дэсанта саджалі кветкі ля музея, прыбіралі тэрыторыю запаведніка.

А потым пачалося спартыўнае свята. Вельмі цікава прайшла турыстычная эстафета і іншыя конкурсы.

Месцы размеркаваліся наступным чынам:

1 — будатрад «Буравеснік»;

2 — IV курс беларускага аддзялення;

3 — інтэратрад імя Фрыца Шменкеля.

У спаборніцтвах па валейболу перамаглі студэнты будатрада «Мара», па футболу — байцы «Буравесніка».

Вось і вычарпана ўся праграма. Дырэктар музея Янкі Купалы Л. Т. Хадасевіч, які выступіў на закрыцці злёту, адзначыў той факт, што такія сустрэчы сталі ўжо добрай традыцыяй. Цяпер Вязынка будзе чакаць сваіх сяброў-філолагаў на IV злёт.

А пасля доўга яшчэ гучалі песні ля кастра. Не хацелася развітвацца з гэтым цудоўным, маляўнічым купалаўскім краем.

**Л. ПАЎЛЮЧЫК,**
**студэнтка журфака.**







**На здымках:** гадзіна паэзіі. Выступае М. Аўрамчык; узняццё сцяга злёту; калону ўзначальваюць барабаншчыцы.

Фота **М. Дубовіка.**

# ШТО ТАКОЕ МАС?

15 красавіка 1978 года стартавала новая латарэя — міжнароднае алімпійскае спортлато (МАС).

МАС заснавалі латарэйныя арганізацыі Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі і Савецкага Саюза. Зараз вырашаецца пытанне аб удзеле ў МАС Польшчы і ГДР.

Мэтай міжнароднага алімпійскага спортлато з'яўляецца прапаганда Алімпійскіх гульняў, папулярызацыя алімпійскага руху ў цэлым, а таксама прыцягненне дадатковых сродкаў у фонд нацыянальных алімпійскіх камітэтаў краін—удзельніц і Аргкамітэта Алімпіяда-80.

50 працэнтаў сродкаў, атрыманых у СССР ад продажу латарэйных білетаў, пойдзе на аплату выйгрышаў, астатнія — у фонд Алімпіяды і на падрыхтоўку савецкіх спартсменаў да гульняў. 25 працэнтаў чыстага даходу ад правядзення латарэі ў Венгрыі, Чэхаславакіі і Балгарыі будзе пералічана Аргкамітэту Алімпіяда-80 для набыцця неабходных матэрыялаў і абсталявання.

Першы тыраж міжнароднага алімпійскага спортлато адбудзецца ў Маскве 19 ліпеня 1978 года, г. зн. за два гады да адкрыцця маскоўскай вялікай алімпіяды. У СССР разыгрываюцца грашовыя выйгрышы ад трох да дзесяці тысяч рублёў і турыстычныя пуцёўкі на Алімпіяду-80 па аднаму з алімпійскіх маршрутаў: Масква, Талін, Ленінград, Мінск, Кіеў. Усяго будзе разыграна 2 тысячы пуцёвак.

Цікава, што ўладальнік аднаго білета можа аказацца ўладальнікам і грашовага выйгрышу і турыстычнай пуцёўкі, так што розыгрыш грашовых выйгрышаў здзяйсняецца па іграой сістэме «6 з 49», а турыстычных пуцёвак—па нумару білета.

Усяго ў 1978—1980 гадах праводзіцца восем выпускаў МАС, прычым па кожнаму выпуску—адзін тыраж.

Паспяхова ідзе рэалізацыя білетаў міжнароднага алімпійскага спортлато ў нашай рэспубліцы. Ужо прададзена значная колькасць білетаў. Продаж працягваецца. Запрашаем вас прыняць удзел у гэтай цікавай гульні. Купіць білеты МАС вы зможаце ў фірменных кіёсках «Спортлато», у грамадскіх распаўсюджвальнікаў і камітэтах фізкультуры. Кошт аднаго білета 60 капеек.

**М. ШАПІРА.**

# Карта, компас і... хуткія ногі




Стрэлка компаса мітусіцца, як шалёная, здаецца, і яе ахапіў гарачы азарт спаборніцтва. Хутчэй, хутчэй супакойся. Трэба сарыентаваць карту... Так, усё правільна. Недзе побач павінна быць лясное возера, ля якога і знаходзіцца чарговы кантрольны пункт.

Вітаючыся, працягваюць лапы хвойкі. Пасля паласы густога ельніку — паляна, быццам казачны храм з блакітным купалам неба, асветлены мноствам яркіх свечак-бяроз. Але любавацца няма часу. Вось яно, люстэрка ляснога возера, а побач — слупок чарговага кантрольнага пункта. Хутка робіш адзнаку на адваротным баку карты — і далей, шукаць наступны КП...

Той, каму хоць аднойчы давялося ўдзельнічаць у спаборніцтвах па спартыўнаму арыентаванню, ужо наўрад ці будзе раўнадушны да гэтага захапляючага віду спорту, які патрабуе добрай лёгкаатлетычнай падрыхтоўкі, трывалага ведання тапаграфіі, вучыць кемлівасці і знаходлівасці. Вось чаму год ад году ўсё больш папулярным спаборніцтвам становіцца першынство БДУ імя У. І. Леніна па спартыўнаму арыентаванню. Дзесятае па ліку першынство сабрала больш 120 студэнтаў з 11 факультэтаў. У іх ліку — кандыдаты ў майстры спорту, разраднікі.

...Завершана ўрачыстая цырымонія адкрыцця, затрапятаў на ветры сцяг спаборніцтва. Атрымаўшы на старце карту і хутка нанёсшы на яе маршрут, удзельнікі адзін за адным знікаюць у лясным гушчары. Задача ў спартсменаў складаная: на дыстанцыі даўжынёй 6,3 кіламетра — 10 кантрольных пунктаў. На пераадоленне дыстанцыі адводзіцца дзве гадзіны. Але не прайшло і паловы адведзенага часу, як на фінішы паказаўся першы ўдзельнік. 41 мінута 56 секунд—вось ён, пераможны вынік студэнта фізічнага факультэта, кандыдата ў майстры спорту Віктара Буракова. Другое месца, уступіўшы яму менш хвіліны, заняў студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Леанід Гарустовіч, на трэцім — Адам Шпакоўскі з фізфака.

У жанчын, якія стартавалі на дыстанцыі 4,34 кіламетра з 9 кантрольнымі пунктамі, другі раз запар перамагла першаразрадніца Святлана Атамановіч (34 мінуты 46 секунд). У ліку прызёраў—Таццяна Кашура і Валянціна Мастыка. Усе тры спартсменкі — з мехмата.

У камандным заліку пераможцамі сталі спартсмены фізічнага факультэта.

Вынікі большасці пераможцаў — вышэйшыя, чым мінулагоднія. Аднак у цэлым узровень падрыхтоўкі арыенціроўшчыкаў пакідае жадаць лепшага. Некаторыя ўдзельнікі прыходзілі к фінішу праз паўтары-дзве гадзіны пасля заканчэння кантрольнага часу. Пры нядрэннай бегавой падрыхтоўцы спартсмены нярэдка «чытаюць» карту «па складах» — вось і даводзіцца замест 6 кіламетраў прабягаць па 20. Аснову каманд складаюць студэнты малодшых курсаў, многія з іх раней не былі знаёмы з гэтым відам спорту. Адбор вядзецца па прынцыпу «добра бегаеш — як-небудзь і сарыентуешся». А варта было б перад спаборніцтвамі арганізоўваць на факультэтах нешта накшталт «падрыхтоўчых курсаў», дзе кандыдаты ў зборную факультэта праходзілі б неабходную тэарэтычную і практычную падрыхтоўку, знаёмячыся з асновамі спартыўнага арыентавання.

# ПАМЯЦІ ГЕРОЯ

Глыбока ўшаноўваюць мінчане памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны. Адным з іх з'яўляецца падпольшчык Герой Савецкага Саюза І. Казінец.

У гонар памяці І. Казінца Мінскім абласным саветам СДСТ «Буравеснік» штогод праводзяцца спаборніцтвы па баскетболу сярод лепшых мужчынскіх студэнцкіх каманд горада.

На гэты раз у барацьбу за кубак уключыліся шэсць баскетбольных каманд: БДІНГ, БІМСГ, МДПІ, БДУ і зборная школьнікаў горада Мінска.

Гульні праходзілі ва ўпартай барацьбе. Ніводная з каманд не пацярпела паражэння. Спрэчку за першае месца ў асноўным вялі тры каманды: інстытута народнай гаспадаркі, педагагічнага інстытута і баскетбалісты нашай ВНУ.

У першы дзень гульняў зборная універсітэта нанесла паражэнне камандзе педагагічнага інстытута з лікам 67:46. У гэтай гульні вызначыліся студэнт гістфака А. Коўзік і супрацоўнік універсітэта майстар спорту А. Шукшын. Яны прынеслі сваёй камандзе па 14 ачкоў.

У наступны дзень каманда МДПІ перамагла баскетбалістаў інстытута народнай гаспадаркі з лікам 76:67. У наступныя дні кожная з гэтых каманд атрымала перамогу.

Апошні дзень гульняў вызначыў уладальніка кубка. Зборная універсітэта прайграла камандзе інстытута народнай гаспадаркі. Тры каманды набралі аднолькавую колькасць ачкоў. Але па розніцы забітых і прапушчаных мячоў кубак, як і ў мінулым годзе, выйгралі баскетбалісты нашай ВНУ. У гэтым туры добрую гульню паказалі студэнты С. Бародзіч (ФПМ), А. Коўзік (гістфак), А. Сямёнаў (гістфак).

**В. ШХІНЬЯН,**
**студэнт журфака.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.